ПАДЧАС ІГРЫШЧА “КАТА ПЯЧЫ” ТАНЦАВАЛІ І БЫЛІ ТАКІЯ ГУЛЬНІ:

1. **“Цыбулька”**
   Вадзіла кладзе маленькую цыбульку сабе паміж далонямі і абыходзіць гульцоў, якія сядзяць і трымаюць свае далоні, куды вадзіла непрыкметна павінен пакласці цыбульку. Абыйшоўшы ўсіх вадзіла адыходзіць і гукае: “Цыбулька ка мне!” Той, каму ён паклаў цыбульку, хутка бяжыць да яго, а суседнія гульцы стараюцца яго затрымаць. Калі змог вырвацца — яму вадзіць.

2. **“У раменьчык”** — гульня з крэслам і лавай. На лаве сядзяць гульцы, а перад імі стаіць крэсла, на ім — рэмень. Адзін выходзіць, бярэ раменьчык і сцёбае каго-небудзь, пасля чаго хуценька кідае раменьчык на крэсла і займае месца таго, каго сцебануў. Той, каго сцебанулі, хутка кідаецца да крэсла і хапае раменьчык. Дзеянні паўтараюцца.

3. **“Лыжка”** — застольная гульня. Пад музыку па кругу (па сонцу) перадаюцьдраўляную лыжку. Калі музыка змоўкла, той, у каго ў руках аказалася лыжка, павінен выканаць тое, што яму загадае застольная грамада. Гэта можа быць песня, танец, анекдот або нейкае дзеянне, якое можна выканаць за сталом седзячы або ўстаўшы.

4. **“Лешч”**
   Адзін гулец становіцца спінаю да астатніх і закрывае вочы далонямі. У гэты час нехта стукае яго па плячы. Ён павінен павярнуцца і ўгадаць — хто.

5. **“Вішанька”**
   Адну дзяўчыну ставяць на табурэтку за “вішаньку”, даюць ёй трымаць у зубах цукерку або нешта іншае салодкае. “Вішанька” – гэта гульня, пры якой хлопец павінен разагнацца, і, абапіраючыся на плечы і рукі двух мужчын, якія стаяць перад “вішанькай”, падскочыць і без дапамогі рук забраць тое, што “вішанка” трымае ў зубах.